— Наш урок мы посвятили светлой памяти наших прадедов, которые мужественно сражались с врагом в годы Великой Отечественной войны, сделали всё возможное для того, чтобы сегодня мы могли жить под мирным небом, ходить в школу и мечтать о будущем.

— Посмотрите на фотографии. Нет ни одной семьи, которую обошла стороной война. Теперь мы с вами знаем, какой ценой досталась победа нашему народу. Мы говорим спасибо нашим прадедам за мир. Будем всегда помнить о подвиге людей, защитивших нашу Родину от врага.

Урок заканчивается песней «Пусть всегда будет солнце». Учитель предлагает учащимся припев песни исполнить хором.

*Примечание.* Продолжение разговора о Великой Отечественной войне можно запланировать на внеурочное время, используя материалы пособия для учителя «Метадычныя матэрыялы для правядзення заняткаў з выкарыстаннем вучэбнага дапаможніка “Беларусь — наша Радзіма. Падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі першакласніку”».

***Тиринова О. И.****, кандидат педагогических наук, доцент, ведущий научный сотрудник лаборатории начального образования НИО*

# Беларуская мова. III клас. Раздзел «Паўтарэнне»

Паўтарэнне ў канцы навучальнага года мае на мэце абагульніць веды вучняў па асноўных раздзелах і тэмах курса беларускай мовы, якія разглядаліся ў III класе. Яно арганізуецца ў наступнай паслядоўнасці:

1-шы ўрок — тэкст, яго прыметы (тэма, асноўная думка, загаловак), віды сказаў па мэце выказвання і інтанацыі, будова сказа; адпрацоўка ўменняў вызначаць віды сказаў па мэце выказвання і інтанацыі, сувязь слоў у сказе па пытаннях;

2-гі ўрок — лексічнае значэнне слова, адназначныя і мнагазначныя словы, прамое і пераноснае значэнне слова, сінонімы, антонімы, міжмоўныя амонімы; адпрацоўка ўменняў тлумачыць лексічнае значэнне слоў, у тым ліку некаторых міжмоўных амонімаў, падбіраць сінонімы, антонімы;

3-ці ўрок — марфемная будова слоў, адпрацоўка ўмення вызначаць значымыя часткі ў слове;

4-ты ўрок — назоўнік і прыметнік, іх прыметы, сувязь прыметнікаў з назоўнікамі, адпрацоўка ўменняў вызначаць род і лік назоўнікаў і прыметнікаў;

5-ты ўрок — змяненне дзеясловаў, адпрацоўка ўменняў вызначаць час і лік дзеясловаў, змяняць іх па часах і ліках.

## Урок 79. Паўтарэнне: тэкст, сказ

***Мэты:*** паўтарыць веды пра тэкст, яго прыметы (тэма, асноўная думка, загаловак), пра віды сказаў па мэце выказвання і інтанацыі, пра будову сказа; узбагачаць слоўнік навучэнцаў сінонімамі, развіваць граматычны лад маўлення; выхоўваць цікавасць да народных традыцый, жаданне захоўваць іх.

***Абсталяванне:*** часткі схемы «Тэкст», схема «Тыпы сказаў».

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце запісаны верш. Якое значэнне мае слова *гула*? *(Гудзела.)* Якой часцінай мовы з’яўляюцца выдзеленыя словы? Назавіце ў вершы дзеясловы. Як вы напісалі *не* з дзеясловамі? У форме якога часу, роду і ліку ўжыты ўсе дзеясловы ў вершы?

**II. Паўтарэнне.**

***1. Актуалізацыя ведаў па тэме «Тэкст».***

На парты раздаюцца часткі піраміды, з якіх вучні могуць скласці наступную схему-піраміду:

| Тэкст | |
|---|---|
| **Тэма** | **Асноўная думка** |
| тое, пра што гаворыцца ў тэксце | галоўнае, пра што аўтар хоча сказаць чытачу |

— Успомніце, чым аб’яднаны сказы ў тэксце. *(Тэмай і асноўнай думкай.)* Папрацуйце ў парах: з частак складзіце піраміду, якая ілюструе асноўныя прыметы тэксту. (Вучні складаюць піраміду, тлумачаць, што такое тэма і асноўная думка тэксту.)

***2. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 223.

— Прачытайце тэкст. (Вучні чытаюць тэкст «ланцужком».) Якія жывёлы з’яўляюцца добрымі рыбакамі? *(Выдра, бусел, журавель, шэрая чапля.)* Пра што гэты тэкст? *(Пра жывёл-рыбакоў.)* Якая яго асноўная думка? *(Шэрая чапля — найлепшы рыбак сярод птушак.)* Якія з прапанаваных загалоўкаў больш падыходзяць да тэксту: «Жывёлы-рыбакі», «Найлепшы рыбак сярод птушак», «На рыбалцы»? (Вучні выбіраюць патрэбны загаловак, абгрунтоўваюць свой выбар.) На што ўказвае выбраны вамі загаловак: на тэму ці на асноўную думку? *(Калі выбралі загаловак «Жывёлы-рыбакі», то ён указвае на тэму тэксту, калі «Найлепшы рыбак сярод птушак» — на асноўную думку.)* Знайдзіце ў тэксце аднакаранёвыя словы. *(Рыбай, рыбакі, рыбачыць, рыбіна.)* Падзяліце тэкст на часткі. Выкарыстайце прапанаваны план. (Вучні вызначаюць межы частак, чытаюць тэкст па частках. Другая частка пачынаецца сказам: *А рыбачыць яна па-майстэрску.*)

Практыкаванне 224.

— Прачытайце сказы. (Чытанне сам сабе.) Папрацуйце ў парах: расстаўце сказы ў патрэбнай паслядоўнасці, каб атрымаўся тэкст. (Вучні аднаўляюць тэкст. Адна пара вучняў чытае яго, астатнія правяраюць правільнасць выка-

нання задання.) Спішыце першы сказ выпраўленага тэксту. Падкрэсліце ў ім галоўныя члены. Вусна пастаўце пытанні ад дзейніка і выказніка да іншых слоў у сказе. (Адзін вучань выконвае заданне на дошцы, астатнія — у сшытках.)

Практыкаванне 225.

— Прачытайце тэкст. (Тры вучні чытаюць, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Чым адметны ліпень? Чаму ён гаручы і даручы? Прачытайце план. Ці адпавядае паслядоўнасць пунктаў плана паслядоўнасці частак у тэксце? Як яе трэба змяніць? (Адзін вучань чытае аднаўлены план.) Спішыце частку тэксту, якая адпавядае малюнку. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца калектыўная праверка напісанага.)

***3. Актуалізацыя ведаў па тэме «Сказ».***

На дошцы вывешваецца схема:

**Тыпы сказаў**

| **па мэце выказвання** | **па інтанацыі** |
| --- | --- |
| 1. Вучні дружна працуюць. | Вучні дружна працуюць! |
| 2. Хто дружна працуе? | Хто дружна працуе?! |
| 3. Давайце дружна працаваць на ўроку. | Давайце дружна працаваць на ўроку! |

— Успомніце, якія бываюць сказы па мэце выказвання і інтанацыі. (Заслухоўваюцца адказы вучняў.)

***4. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 226.

— Прачытайце верш з патрэбнай інтанацыяй. (Некалькі вучняў выразна чытаюць верш.) Спішыце. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку ў канцы сказаў. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі настаўнік прад'яўляе на слайдзе прэзентацыі ўзор правільнага афармлення сказаў на пісьме. Праводзіцца самаправерка напісанага.)

Практыкаванне 227.

— Прачытайце тэкст. (Чытанне сам сабе.) Вызначыце ў ім віды сказаў па мэце выказвання. (Вучні па чарзе зачытваюць сказы, называюць іх віды па мэце выказвання.) Выпішыце клічныя сказы. У пабуджальным сказе падкрэсліце дзеясловы. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца калектыўная праверка напісанага.)

Практыкаванне 228.

— Прачытайце скорагаворкі. Назавіце ў іх галоўныя члены сказа. Вусна пастаўце пытанні да астатніх слоў у сказах. (Два вучні па чарзе вусна робяць сінтаксічны разбор сказаў.) Які сказ адпавядае схеме, прапанаванай у практыкаванні? *(Першы.)* Запішыце гэты сказ. (Запіс з каменціраваннем.) Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць запісаную скорагаворку. (Праводзіцца конкурс на лепшага чытальніка скорагаворкі.) Падбярыце сінонім да слова *бацян. (Бусел.)*

**III. Падвядзенне вынікаў урока.**

— Якія прыметы тэксту ўспомнілі на ўроку? Якія тыпы сказаў па мэце выказвання і інтанацыі вам вядомыя? Што такое дзейнік і выказнік?

**IV. Дамашняе заданне.**

Практ. 229.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання неабходна скласці сказы з асобных слоў і адказаць, ці ўтвараюць сказы тэкст. Акрамя гэтага, трэба падкрэсліць дзейнік і выказнік у першым сказе і намаляваць яго схему.

## Урок 80. Паўтарэнне: значэнне слова

***Мэты:*** паўтарыць веды навучэнцаў пра адназначныя і мнагазначныя словы, прамое і пераноснае значэнне слова, пра сінонімы, антонімы і міжмоўныя амонімы; узбагачаць слоўнік навучэнцаў; выхоўваць сяброўскія адносіны паміж аднакласнікамі, культуру маўлення.

***Абсталяванне:*** тлумачальны слоўнік беларускай мовы, толковый словарь русского языка.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце сказы, якія ў вас атрымаліся. Ці ўтвараюць яны тэкст? *(Так.)* Які загаловак можна даць гэтаму тэксту? *(У чэрвені.)* Назавіце ў першым сказе галоўныя члены. Якую схему вы намалявалі да гэтага сказа? (Адзін вучань выходзіць да дошкі, малюе схему сказа, астатнія правяраюць, ці супадае схема на дошцы са схемай у сшытку.)

**II. Паўтарэнне.**

***1. Актуалізацыя ведаў па тэме «Значэнне слова».***

На дошцы вывешваецца схема:




— Разгледзьце схему, змешчаную на дошцы і раскажыце, якімі па значэнні могуць быць словы. *(Блізкімі па значэнні — сінонімы; супрацьлеглымі па значэнні — антонімы; аднолькавымі або падобнымі па гучанні, але рознымі па значэнні ў рускай і беларускай мовах.)*

***2. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 230.

— Прачытайце верш. (Адзін вучань чытае, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Якой вы ўявілі сабе сароку? Якая асаблівасць паводзін сарокі прыгадваецца ў вершы? (Выслухоўваюцца адказы вучняў.) Знайдзіце ў вершы антонімы і выпішыце іх. *(Недалёка — далёка.)* Падбярыце і запішыце антонімы да выдзеленых слоў. *(Белы — чорны, высокі — нізкі (невысокі).* Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца калектыўная праверка напісанага.*)*

Практыкаванне 231.

— Пазнаёмцеся за значэннямі слова *плётка* ў беларускай мове. (Чытанне сказаў сам сабе.) У якім значэнні ўжываецца гэтае слова ў вершы з практыкавання 230? *(Ілжывая чутка.)* Запішыце адпаведны сказ. (Спісванне з каменціраваннем.) Звярніцеся да слоўніка і адкажыце, якое значэнне мае гэтае слова ў рускай мове. *(Короткий кнут из перевитых ремней или верёвок. Праца са слоўнікам можа быць арганізавана ў парах.)*

Практыкаванне 232.

— Прачытайце словы. Знайдзіце сярод іх сінонімы. Запішыце кожную групу сінонімаў з новага радка. (Тры вучні працуюць каля дошкі, астатнія запісваюць словы ў сшыткі.)

Практыкаванне 233.

— Прачытайце прыказкі. Пазнаёмцеся са словамі для даведкі. (Чытанне сам сабе.) Сфармулюйце заданне да практыкавання. (Вучні выказваюць свае меркаванні. Калектыўна робіцца выснова: *неабходна дапоўніць*

*прыказкі словамі, супрацьлеглымі па значэнні да выдзеленых.*) Выканайце пісьмова гэтае заданне. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца калектыўная праверка напісанага.)

Перакладзіце слова *плот* на рускую мову, растлумачце яго значэнне. *(Забор. Плот — агароджа вакол чаго-небудзь.* Пры неабходнасці вучні карыстаюцца тлумачальным слоўнікам.*)* Якое значэнне мае рускае слова *плот*? *(Скреплённые в несколько рядов брёвна для сплава или переправы на них по воде.* Пры неабходнасці вучні карыстаюцца тлумачальным слоўнікам рускай мовы. Праца са слоўнікам можа быць арганізавана ў парах.*)*

Практыкаванне 234.

— Прачытайце вершаваныя радкі. (Чытанне сам сабе.) Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць іх. (Некалькі вучняў спрабуюць хутка і правільна вымавіць скорагаворку.) Ці спрытны смоўж на самой справе? Запішыце сказ па памяці. Падкрэсліце ў ім антонімы. (Пасля самастойнага выканання задання праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.) Падбярыце і запішыце сінонім да выдзеленага слова. *(Слімак.)*

**III. Падвядзенне вынікаў урока.**

— Што такое сінонімы? Прывядзіце прыклады сінонімаў. Што такое антонімы? Прывядзіце прыклады антонімаў. Якое значэнне мае слова *дыван* у беларускай мове? Што абазначае слова *диван* у рускай мове?

**IV. Дамашняе заданне.**

Практ. 235.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання неабходна адгадаць загадку, спісаць яе, знайсці і падкрэсліць у сказе антонімы.

## Урок 81. Паўтарэнне: склад слова

***Мэты:*** паўтарыць веды навучэнцаў пра марфемную будову слоў, адпрацоўваць уменне вызначаць значымыя часткі ў слове; узбагачаць слоўнік навучэнцаў аднакаранёвымі словамі, прыказкамі; выхоўваць любоў да прыроды роднага краю.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце загадку. Якую яна мае адгадку? *(Гарлачык.)* Якія словы-антонімы сустрэліся ў загадцы? *(Днём — уначы.)* У прамым ці пераносным значэнні ўжыта ў загадцы выдзеленае слова? *(У пераносным.)* Прыдумайце сказ, у якім гэтае слова будзе ўжыта ў прамым значэнні. (Выслухоўваюцца адказы некалькіх вучняў.)

**II. Паўтарэнне.**

***1. Актуалізацыя ведаў па тэме «Склад слова».***

— Адгарніце форзац 1 падручніка, разгледзьце схему «Склад слова». Якія часткі можна вылучыць у слове? Што такое корань? Якія часткі служаць для ўтварэння новых слоў? Якая частка служыць для ўтварэння форм слова?

***2. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 236.

— Прачытайце тэкст. (Адзін вучань чытае, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) У чым карысць суніц? Як трэба іх збіраць? Назавіце ў тэксце аднакаранёвыя словы. Запішыце іх, разбярыце па саставе. (Вучні прыгадваюць алгарытм разбору слова па саставе, вылучаюць усе значымыя часткі ў наступных словах: *вар-аць, вар-энн-е; суніц-ы, суніч-н-ы; чэрвень — чэрвень-ск-і.*)

Практыкаванне 237.

— Прачытайце скорагаворку. (Чытанне сам сабе.) Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць яе. (Некалькі вучняў спрабуюць хутка і правільна вымавіць скорагаворку.) Спішыце. Абазначце корань у аднакаранёвых словах. (Спісванне з каменціраваннем, вылучэнне аднакаранёвых слоў *індык, індыч-ка, індыч-аняты.* Звяртаецца ўвага на гістарычнае чаргаванне зычных у корані слоў.) Знайдзіце ў скорагаворцы словы з прыстаўкамі. Абазначце ў іх прыстаўкі. (Вучні прыгадваюць алгарытм вылучэння прыстаўкі ў слове, прымяняюць яго пры разборы слоў *не-вялічкай, пра-ходжваюць.*)

Практыкаванне 238.

— Прачытайце верш. (Адзін вучань чытае, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) З кім параўноўваецца ў ім месяц? На што падобнае неба ў вершы? Падбярыце сінонім да слова муражок (мурог). *(Трава.)* Спішыце, устаўляючы ў словы патрэбныя літары. (Спісванне з каменціраваннем.) Знайдзіце словы з памяншальна-ласкальным значэннем. *(Пастушок, муражок, зорачкі, сонейку.)* Для чаго аўтар выкарыстоўвае гэтыя словы ў вершы? *(Каб з ласкай і пяшчотай апісаць ноч.)* Абазначце суфіксы ў выдзеленых словах. (Вучні прыгадваюць алгарытм вылучэння суфікса ў слове. Звяртаецца ўвага на суфіксы з памяншальна-ласкальным адценнем. Калі ў працэсе падбору аднакаранёвых слоў вучні заўважаць, што словы *пастух — пасу — выпас* маюць корань *-пас-*, то настаўнік можа растлумачыць, што ў слове пастушок вылучаюць два суфіксы: *пас-туш-ок.*)

Практыкаванне 239.

— Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць? (Два вучні па чарзе чытаюць прыказкі, тлумачаць іх сэнс.) Спішыце, раскрываючы дужкі. (Запіс з каменціраваннем.) Выдзеліце прыстаўкі ў словах. *(С-казаць, ня-лёгка, з-рабіць, с-казана, з-вязана.)*

**III. Падвядзенне вынікаў урока.**

На дошцы запісана слова *казка.*

— Якія часткі можна вылучыць у слове? Назавіце паслядоўнасць дзеянняў пры разборы слова па саставе. Разбярыце па саставе слова, запісанае на дошцы.

**IV. Дамашняе заданне.**

Практ. 240.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання неабходна адгадаць загадку і спісаць яе, раскрываючы дужкі. Акрамя гэтага, трэба выканаць дадатковае заданне:

1-шы варыянт: у выдзеленых словах абазначыць прыстаўкі;

2-гі варыянт: знайсці ў загадках аднакаранёвыя словы, выдзеліць у іх корань.

## Урок 82. Паўтарэнне: назоўнік, прыметнік

***Мэты:*** паўтарыць веды навучэнцаў пра назоўнік і прыметнік, іх прыметы, пра сувязь прыметнікаў з назоўнікамі, адпрацоўваць уменне вызначаць род і лік назоўнікаў і прыметнікаў; развіваць граматычны лад маўлення; выхоўваць любоў да прыроды, эстэтычныя пачуцці.

***Абсталяванне:*** тлумачальныя слоўнікі.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Прачытайце першую загадку. Якую яна мае адгадку? *(Рака.)* Прачытайце другую загадку. Якія яна мае адгадкі? *(Навальніца, вясёлка.)* Якія літары вы ўставілі ў словы *лясоў, удалеч, весела, каляровы*? Якое правіла прымянілі? Якую прыстаўку напісалі ў слове *разразала*? Чаму? Як вы напісалі *не* з дзеясловамі? Якія прыстаўкі маюць выдзеленыя словы? Якія аднакаранёвыя словы сустрэліся ў загадках? *(Удалеч, далі.)* Які корань яны маюць?

**II. Паўтарэнне.**

***1. Актуалізацыя ведаў па тэмах «Назоўнік», «Прыметнік».***

— Адгарніце форзац 1 падручніка. З апорай на схему «Часціны мовы» адкажыце, што такое назоўнік

(прыметнік). Як вызначыць род назоўнікаў? Ад чаго залежыць род і лік прыметнікаў?

***2. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 241.

— Прачытайце верш. (Адзін вучань чытае, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Якія колеры ў лета? Словамі якіх часцін мовы аўтар перадаў гэтыя колеры? *(Назоўнікамі, прыметнікамі.)* Выпішыце з верша назоўнікі ў тры слупкі на ўзор. (Адзін вучань выконвае заданне на дошцы, астатнія — у сшытках.) Выпішыце з тэксту прыметнікі. Разбярыце іх па саставе. *(Малін-ав-ай, брусніч-н-ае, зялён-ы.)*

Практыкаванне 242.

— Прачытайце вершаваныя радкі. Падбярыце сінонімы да слоў у дужках так, каб захавалася рыфма. (Два вучні па чарзе чытаюць сказы, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Запішыце блізкія па сэнсе назоўнікі. *(Адуванчыкі — дзьмухаўцы, валошка — васілёк.)* Вызначыце іх род. (Вучні прыгадваюць, як вызначыць род у назоўніках у форме множнага ліку.)

Практыкаванне 243.

— Прачытайце і адгадайце загадку. (Чытанне сам сабе. Называнне слова-адгадкі — *лаўка*.) Звярніцеся да тлумачальнага слоўніка і адкажыце, якія значэнні мае слова-адгадка. (Праца ў групах. Звяртаецца ўвага вучняў на тое, што лаўка як прыстасаванне для сядзення на некалькі чалавек і лаўка як невялікі магазін — гэта розныя словы. Настаўнік засяроджвае ўвагу вучняў на тым, як значэнне гэтых слоў падаецца ў слоўніку.) Дапоўніце групы сінонімаў словам-адгадкай. Запішыце словы-сінонімы. Якой часцінай мовы яны з'яўляюцца? *(Назоўнікі.)* Вызначыце іх род. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца калектыўная праверка напісанага.)

Практыкаванне 244.

— Прачытайце тэкст. (Чытанне ланцужком.) Чым адметны першы месяц лета? Выпішыце з тэксту прыметнікі разам з назоўнікамі, з якімі яны звязаны па сэнсе. Вызначыце лік і род прыметнікаў. (Адзін вучань выконвае заданне на дошцы, астатнія — у сшытках. Засяроджваецца ўвага на тым, што ў прыметніках у форме множнага ліку род не вызначаецца.)

Практыкаванне 245.

— Прачытайце. (Адзін вучань чытае, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) Якія радкі верша падказалі вам, што аўтар клапоціцца пра прыроду? *(Два апошнія радкі.)* Спішыце. Знайдзіце ў вершы прыметнікі. Выдзеліце іх канчаткі і вызначыце лік. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.) Які з прыметнікаў ужыты ў пераносным значэнні? *(Залатыя.)* Прыдумайце сказ, у якім гэты прыметнік будзе ўжывацца ў прамым значэнні. (Выслухоўваюцца адказы некалькіх вучняў.)

Практыкаванне 246.

— Прачытайце прыказку і запомніце яе. Чаму так гавораць? (Вучні тлумачаць сэнс прыказкі.) Спішыце, раскрываючы дужкі. Знайдзіце і падкрэсліце ў ёй супрацьлеглыя па сэнсе прыметнікі. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца калектыўная праверка напісанага.) Якое значэнне мае слова *благі* ў беларускай мове? *(Дрэнны, непрыемны для іншых.)* Якое значэнне мае слова *благой* у рускай мове? *(Добрый.)*

**III. Падвядзенне вынікаў урока.**

— Што маюць назоўнікі? Як яны змяняюцца? Як змяняюцца прыметнікі? Як вызначыць род і лік прыметнікаў?

**IV. Дамашняе заданне.**

Практ. 247.

— Пры выкананні дамашняга практыкавання неабходна спісаць верш, раскрываючы дужкі, назваць пабуджальныя сказы, абазначыць лік прыметнікаў.

## Урок 83. Паўтарэнне: дзеяслоў

***Мэты:*** паўтарыць веды навучэнцаў пра змяненне дзеясловаў, адпрацоўваць уменне вызначаць час і лік дзеясловаў, змяняць іх па часах і ліках; адпрацоўваць вымаўленчыя навыкі, развіваць граматычны лад маўлення, кемлівасць навучэнцаў; выхоўваць культуру маўлення.

**I. Праверка дамашняга задання.**

— Выразна прачытайце пабуджальныя сказы, якія сустрэліся ў вершы. Як вы напісалі *не* з дзеясловам? Якія прыметнікі ёсць у вершы? У форме якога ліку яны ўжыты? *(У форме множнага ліку.)*

**II. Паўтарэнне.**

***1. Актуалізацыя ведаў па тэме «Дзеяслоў».***

— Што такое дзеяслоў? Адгарніце форзац 2 падручніка. З апорай на схемы адкажыце, як змяняецца дзеяслоў. Які час дзеяння ён можа перадаваць?

***2. Праца з падручнікам.***

Практыкаванне 248.

— Прачытайце. (Адзін вучань чытае, астатнія слухаюць і сочаць за тым, каб усе словы пры чытанні вымаўляліся правільна.) На каго падобнае лета ў вершы? Якія словы дапамаглі вам уявіць лета гарэзлівай дзяўчынкай? *(У стракатым сарафане, скача, спявае.)* Спішыце. Вызначыце час і лік выдзеленых дзеясловаў. У дзеяслова прошлага часу вызначыце род. (Запіс з каменціраваннем.) У прамым ці пераносным значэнні ўжыты гэтыя дзеясловы ў вершы? *(У пераносным.)* Вусна складзіце сказы, у якіх дзеясловы *скача, спявае, адкажа* будуць ужывацца ў прамым значэнні. (Выслухоўваюцца адказы некалькіх вучняў.)

Практыкаванне 249.

— Прачытайце. Знайдзіце ў кожным радзе слоў лішняе. (Вучні называюць лішняе слова *цячэ* ў першай групе, *прынеслі* — у другой групе, *растуць* — у трэцяй групе.) Запішыце астатнія словы. Назавіце прымету, якая аб'ядноўвае словы кожнага рада. (Тры вучні па чарзе запісваюць групы дзеясловаў на дошцы, называюць форму часу, якой аб'яднаны дзеясловы кожнай групы. Астатнія выконваюць заданне ў сшытках.)

Развіццё маўлення.

— Раскажыце, якія прыемныя заняткі чакаюць дзяцей летам. Выкарыстайце запісаныя дзеясловы. (Выслухоўваюцца выказванні некалькіх вучняў. Звяртаецца ўвага на тое, што ў выказванні можна змяняць час дзеясловаў.)

Практыкаванне 250.

— Прачытайце жарт. (Чытанне сам сабе.) Што выклікала ў вас усмешку? Якой часцінай мовы з'яўляюцца выдзеленыя словы? (Адзін вучань называе часціны мовы.) Выпішыце дзеясловы прошлага часу. Абазначце ў іх суфіксы. Вызначыце іх лік і род. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца калектыўная праверка напісанага.)

Практыкаванне 251.

— З асобных слоў складзіце і запішыце сказы. Падкрэсліце ў іх дзейнік і выказнік. (Чатыры вучні па чарзе запісваюць сказы на дошцы, падкрэсліваюць у іх граматычную аснову, вызначаюць род і лік назоўнікаў-дзейнікаў. Астатнія выконваюць заданне ў сшытках. Звяртаецца ўвага на тое, што па форме дзеясловаў у сказах можна вызначыць род назоўнікаў.)

Практыкаванне 252.

— Прачытайце слоўнікавыя словы ў красвордзе. Якія літары пішуцца ў іх на месцы пропускаў? Якой часцінай мовы з'яўляецца кожнае слоўнікавае слова? (Вучні па чарзе чытаюць словы, называюць у іх прапушчаныя літары, вызначаюць, да якой часціны мовы адносяцца словы.)

Практыкаванне 253.

— Прачытайце і адгадайце загадкі. (Вучні па чарзе чытаюць загадкі, называюць словы-адгадкі *рака, туман.*) Якія дзеясловы дапамаглі вам знайсці адгадкі? Спішыце загадкі, раскрываючы дужкі. Вызначыце час і лік дзеясловаў. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

Практыкаванне 254.

— Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць яе. (Некалькі вучняў расказваюць скорагаворку.) Запішыце скорагаворку па памяці. Знайдзіце ў ёй дзеясловы прошлага часу. Вызначыце іх лік і род. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

Развіццё маўлення.

— Прыдумайце падобную скорагаворку, замяніўшы слова *зебра* на слова *заяц*. Як змяніліся дзеясловы ў ёй? *(Змянілася форма роду дзеясловаў.)*

**III. Падвядзенне вынікаў урока.**

— З якімі часцінамі мовы пазнаёміліся ў трэцім класе? Што такое назоўнік (прыметнік, дзеяслоў)? Як змяняюцца назоўнікі (прыметнікі, дзеясловы)? Для чаго служаць у сказе прыназоўнікі?

**Крыніцы ілюстрацый:** http://stroysezon.ru/upload/iblock/25f/25f70bc61681d677647e280a7ab0daee.jpg; http://sagatheball.ru/wp-content/uploads/2012/04/tennis-ball-no-logo1-517x300.jpg; https://publicdomainvectors.org/photos/egore911_basketball.png; https://encrypted-tbn0.gstatic.com/images?q=tbn:ANd9GcQS7vEMfXXJ0F7NNBjFx_-IByU-wcv0ox2USIfUwo77Y9JEGMdP.

***Свірыдзенка В. І.**, кандыдат педагагічных навук,*
*дацэнт кафедры беларускага і рускага моваўнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ*

# Практыкаванні са слоўнікавымі словамі*

***Адцвітаць.***

*1. Расшыфруйце слоўнікавае слова і запішыце яго.*

| 6 | 2 | 4 | 7 | 3 | 5 | 1 | 9 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| т | д | в | а | ц | і | а | ь | ц |

*2. Прачытайце аднакаранёвыя словы. Выдзеліце ў іх корань і прыстаўку.*

адцвітаць — зацвітаць — дацвітаць

*3. Дапоўніце сказ слоўнікавым словам.*

Дрэвы пачалі ____________ . Пялёсткі кветак асыпаюцца.

*4. Прачытайце верш. Для чаго людзі вырошчваюць грэчку?*

Грэчка

Жаданы госць
Яна заўсёды
На палетках нашых.
Зацвіце —
Адорыць мёдам.
А..цвіце —
Блінамі, кашай. *(М. Пазнякоў* [1, с. 191]*)*

Палетак — участак поля, які выкарыстоўваецца пад пасевы.

*Устаўце ў слова прапушчаную літару.*

*Знайдзіце ў вершы антонімы. Запішыце гэтыя словы. Абазначце ў іх прыстаўку.*

*5. Прачытайце загадку. З «рассыпаных» літар складзіце слова-адгадку.*

Пойдзе дож.. —
І над праспектам
Ра..цв..таюць
Розным кветам. [п] [с] [р] [н]
Варта сонейку зазззяць — [а] [о] [а] [ы]
І зусім іх не відаць. *(М. Пазнякоў* [1, с. 91–92]*)*

*Устаўце ў словы прапушчаныя літары.*

*Знайдзіце і падкрэсліце ў загадцы аднакаранёвае слова да слоўнікавага слова **адцвітаць**.*

***Смяяцца.***

*1. Разгадайце рэбус. Запішыце слоўнікавае слова.*

**смя**  **ца** ______

*Абазначце націск у слоўнікавым слове. Падкрэсліце першы склад перад націскам.*

*2. Падбярыце і запішыце супрацьлеглае па значэнні слова да прапанаванага.*

плакаць — ____________

*3. Дапоўніце сказ слоўнікавым словам.*

Петрык любіць ___________ з жартаў дзядулі.

*4. Дапоўніце ўстойлівыя выразы слоўнікавым словам.*

____________ ў бараду

| смяяцца ціха, непрыкметна | хтосьці робіць штосьці недарэчнае, вартае насмешкі |
|---|---|

куры будуць ____________

*Злучыце кожны выраз з яго значэннем.*

*5. Дапішыце слоўнікавае слова ва ўстойлівыя выразы.*

____________________ ў бараду

____________________ у рукаў

куры будуць ____________

*Злучыце паміж сабой блізкія па значэнні выразы.*

* Малюнкі да слоўнікавых слоў змешчаны на каляровай укладцы.